**УДК 392.3 (=161.3):37.018.1**

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ЭВАЛЮЦЫІ ТРАДЫЦЫЙ СЯМЕЙНАГА ВЫХАВАННЯ БЕЛАРУСАЎ У XIX – XX СТАГОДДЗЯХ

***канд. гіст. навук Л.В. РАКАВА***
***(Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, Мінск)***

*Традыцыі сямейнага выхавання беларусаў XIX – XX стагоддзяў уяўляюць сабой складаную сістэму, якая спалучае светапоглядныя каштоўнасці, сацыяльныя нормы і ўласна педагагічныя прыёмы. Пры гэтым неабходна разумець традыцыі сямейнага выхавання як дынамічны і зменлівы феномен этнічнай культуры, які, захоўваючы важнейшыя каштоўнасныя ўстаноўкі народа, гнутка рэагуе і на сацыяльныя, эпахальныя і культурныя змены. Сабраныя даследчыкамі этнаграфіі дзяцінства матэрыялы па розных народах, як правіла, тэарэтычна недастаткова асэнсаваныя і па большай частцы апісальныя. Вельмі часта ў педагагічных даследаваннях, напрыклад, не адрозніваюцца сацыяльна-маральныя ідэалы выхавання дзяцей і рэальная педагагічная практыка, якая можа адрознівацца. Патрабуецца междысцыплінарны падыход да даследавання цэласнай карціны ладу жыцця дзяцей у беларусаў, вызначэння гістарычна склаўшыхся народных традыцый выхавання, лепшыя з якіх неабходна выкарыстоўваць у сучаснай практыцы.*

**Уводзіны.** Актуальнасць тэмы даследавання звязана з тым, што тэарэтычнае асэнсаванне і абгрунтаванне эвалюцыйных змен, якія адбыліся ў сямейных традыцыях выхавання на працягу двух стагоддзяў, на сённяшні дзень адсутнічае. Беларусы на працягу многіх стагоддзяў выпрацавалі сваю аптымальную сістэму выхавання і навучання дзяцей, падлеткаў, моладзі, якая павінна была забяспечыць перадачу жыццёва неабходных навыкаў, уменняў, ведаў аб прыродзе і сацыяльных сувязях у грамадстве дзякуючы традыцыям. Дынамічныя працэсы, якія адбываюцца сёння ў грамадстве, значна апераджаюць развіццё сямейнага выхавання і сацыялізацыі. Патрэбная сённяшняму беларускаму грамадству сістэма трансфармацыі выхавання і сацыялізацыі, павінна абапірацца на спецыфіку этнічнай культуры. Адсутнасць цэласнага гістарычнага аналізу працэсаў выхавання і сацыялізацыі, акрамя апісання працэсаў выхавання ў традыцыйным грамадстве, робіць работу актуальнай. Аўтарам пастаўлена задача разгледзіць існуючыя метадалагічныя канцэпцыі і падыходы ў вывучэнні традыцый сямейнага выхавання ў гістарычнай перспектыве, якія дапамогуць раскрыць змест сямейных выхаваўчых традыцый беларусаў, паказаць дынаміку іх развіцця і механізмы іх функцыяніравання (перадача, засваенне і фарміраванне маральных якасцей) на аснове аналізу ідэй філософаў, педагогаў, этнографаў, псіхолагаў і інш.

**Асноўная частка.** Дзяцінства – катэгорыя культурна-гістарычная, універсальнага дзяцінства не існуе, бо яно ў розных культурах, у розных эпохах адрозніваецца. Пры вывучэнні традыцый сямейнага выхавання вельмі важным для нас з’яўляецца прынцып гістарызму. Немагчыма зразумець многія праблемы сучаснага дзяцінства без ведання працэсаў, якія адбываліся ў папярэднія эпохі, без традыцый, якія склаліся шмат вякоў таму. Таму аўтарам была пастаўлена задача прыцягнення актавых дакументаў XVI – XVIII стагоддзяў, у якіх разглядаліся пытанні, звязаныя з дзецьмі. Цікавасць да дзяцінства, як паказвае аналіз, узнікла толькі на пэўным этапе развіцця чалавецтва. Перш чым дзяцінства стала прадметам спецыяльных даследаванняў, чалавецтва асэнсоўвала яго ў літаратуры, скульптуры, жывапісу і народнай педагогіцы.

Першым, хто дэтальна прааналізаваў, як у ходзе гісторыі ў свядомасці мастакоў, скульптараў, пісьменнікаў складваліся вобразы дзяцінства, малалецтва і юнацтва і чым яны адрозніваліся ў розныя эпохі, быў французскі дэмограф і гісторык Філіп Ар’ес. Паняцця дзяцінства, на думку Ф. Ар’еса, не было ў культуры Сярэднявечча, дакладней, не існавала ўсведамлення спецыфічнасці прыроды дзяцінства ў параўнанні з дарослацю. На аснове сабранага вялізнага культуралагічнага матэрыялу ён правёў аналіз шматлікіх фактаў і зрабіў спробу выявіць устойлівыя заканамернасці гэтага працэсу ў сваіх працах «Века детства», «Человек перед лицом смерти», «Ребенок и семейная жизнь при Старом Режиме» [1]. Гэта ў найбольшай ступені абумоўлівае метадалагічную важнасць яго прац для разумення і сучасных праблем дзяцінства. У іх Ф. Ар’ес даследуе двайную эвалюцыю дзяцінства ў еўрапейскай свядомасці: эвалюцыю ўяўленняў аб дзяцінстве як асобым перыядзе жыцця з паступовым ускладненнем яго перыядызацыі і адпаведным змяненнем ролі дзіцяці ў сям’і, а таксама паралельную эвалюцыю сістэмы адукацыі, станаўлення пачатковай і сярэдняй адукацыі, якія спрыялі прыняццю ёю важнейшых сацыялізуючых і выхаваўчых функцый, якія не магла выконваць тагачасная сям’я з-за таго, што дзіця больш сацыялізавалася не ў сям’і, а «ў людзях», куды рана аддавалі яго для навучання пэўнай прафесіі. Дзяцінства лічылася малацэнным і хутка праходзячым этапам, пасля якога, мінуючы юнацтва, яны пераходзілі ў разрад дарослых, змешваючыся з дарослымі ў працы, гульнях і г.д. Ф. Ар’есу належыць прыярытэт у вызначэнні ў Новы час больш дакладных храналагічных і змястоўных адрозненняў дзіцячага і дарослага свету, а таксама з’яўленне новага вобраза дзяцінства і прызнанне за ім аўтаномнай, самастойнай сацыяльнай і псіхалагічнай каштоўнасці. Гэта адкрывае магчымасць для разумення многіх працэсаў, якія адбываліся ў больш позні час у эвалюцыі ўяўленняў аб дзецях і дзяцінстве. Па сведчанні Ф. Ар’еса, «адкрыццё дзяцінства» ў мас-

тацтве адбываецца з XII стагоддзя з рэлігійна-алегарычных сюжэтаў, калі на палотнах з'яўляюцца дзеці ў вобразах ангелаў, херувімаў і г.д., затым у новай іконаграфіі з мноствам бытавых дзіцячых сцэн і асабліва ў свецкай іканаграфіі (XV – XVI стст.), дзе дзеці адлюстраваны ў сям'і, на руках маці, гуляючымі, апранутыя ў саслоўныя касцюмы з прычоскай, якая не адрознівалася ад прычоскі дарослых. У XVII – XVIII стагоддзях з'яўляюцца першыя партрэтныя выявы рэальных дзяцей у спецыяльным адзенні, адпаведным узросту, а ў літаратуры з'яўляюцца вобразы дзяцей з іх спецыфічнай дзіцячай мовай, а таксама новыя найменні дзяцей (напрыклад, «ребенок»), паступова набываючыя значэнне, якое яны маюць зараз.

Дзяцінства ў часы Сярэднявечча лічылася малацэнным і хутка праходзячым этапам, калі фізічна незагартаванае дзіця змешвалася з дарослымі ў працы, гульнях, мінуючы юнацтва. Адносную абыякавасць да дзяцей, характэрную для гэтага часу, Ф. Ар'ес тлумачыў вынікам высокай нараджальнасці і вялікай дзіцячай смяротнасці. Ён прыйшоў да правільнай высновы аб тым, што пры ўсіх гістарычных і міжкультурных адрозненнях адносін да дзяцей, перыядызацыі жыццёвага шляху, стыль выхавання і іншае з'яўляюцца транскультурнымі універсаліямі, якія існуюць у многіх народаў, што пацвярджаецца многімі даследаваннямі. Толькі ў XVI – XVII стагоддзях, згодна даследаванняў Ф. Ар'еса, сітуацыя мяняецца і дзіця займае ў сям'і належнае месца, калі яно «становіцца неабходным элементам паўсядзённага жыцця, клопаты аб яго выхаванні, уладкаванні, будучым пераходзяць у разрад важнейшых катэгорый. Яно не стала яшчэ стрыжнем сістэмы, аднак яго вобраз набывае важны змест» [1, с. 403 ]. Пры гэтым ён падкрэслівае, што эвалюцыя закранула пераважна сем'і прывілеяванага саслоўя і разбагацелых сялян [1, с. 404 ]. Вядомы французскі гісторык Лойда Дэмоз, прызнаючы вялікую каштоўнасць прац Ф. Ар'еса як класіка ў вывучэнні трансфармацыі дзяцінства, сцвярджаў, што палажэнне аб адсутнасці паняцця «дзяцінства», уведзенага Ф. Ар'есам, легкаважнае, на якое «клюнулі» многія гісторыкі [5, с. 17 ].

Згодна аналізу актавых дакументаў XVI – XVIII стагоддзяў, праведзенаму аўтарам дадзенай работы, у постфігуратыўнай культуры (па М. Мід) беларускага этнасу дзеці сапраўды бачна выдзяляліся ад дарослых па ўзроставых ступенях, якія абазначаліся спецыяльнымі тэрмінамі: «детинность», «детство», «детинные лета», а клопат аб іх, як бачна з дакументаў, з'яўляўся асаблівасцю сямейных узаемаадносін у феадальны час. У эвалюцыі ўяўленняў аб дзяцінстве важная роля належыць дзеячам эпохі Асветніцтва, якія разглядалі дзяцей як аб'ект выхавання. У характэрных для гэтага часу літаратурных творах, прызначаных спецыяльна для дзяцей, праследваліся дыдактычныя і павучальныя мэты, а само дзяцінства разглядалася не як самацэнны этап жыцця, а як падрыхтоўка да яго. Супрацьлеглая пазіцыя наглядалася ў рамантычнай літаратуры, якая ўстанаўлівае культ дзіцяці і культ ідэалізаванага дзяцінства, дзе дзіця фігурыруе не як рэальны, а як абстрактны сімвал нявіннасці. Вобразы дзяцінства пастаянна эвалюцыяніруюць. Характарызуючы працэсы гістарычных трансфармацый дзяцінства, вядомы расійскі даследчык І.С. Кон адзначае, што, калі ў сентыменталістаў і рамантыкаў «нявіннае дзяцінства» выглядае ціхамірным часам шчасця, то ў рэалістычных раманах (Т. Манна, Р. Ролана, А. Франса. Ф.М. Дастаеўскага і інш.) з'яўляюцца вобразы бедных, пазбаўленых сям'і дзяцей, ахвяр хатняй ці школьнай тыраніі [6, с. 11 ]. Аб дзяцінстве, яго праявах, ролі дзяцей у сям'і і грамадстве разважалі амаль усе буйныя мысліцелі мінулага: Платон, Ж.-Ж. Русо, К. Маркс, Л. Фейербах, Ч. Дарвін. Аднак толькі ў XIX – XX стагоддзях дзяцінства ва ўсіх яго праявах у культурах розных народаў становіцца прадметам спецыяльных даследаванняў. У замежнай этнаграфіі, сацыялогіі і псіхалогіі XIX – XX стагоддзяў праблемам дзяцінства ўдзялялі ўвагу Г. Спенсер, Р. Тайлар, М. Мід, З. Фрэйд, Ф. Фрэбель, Э. Кей, М. Кле, Л.С. Выгоцкі, Д.Б. Эльконін і інш., якія аддавалі перавагу абагульняючым працам параўнальнага характару.

У сацыяльных навуках важны для нас тэрмін «традыцыя» мае вялікую колькасць трактовак, якія польскім даследчыкам Ежы Шацкім былі сістэматызаваны па трох асноўных групах: функцыянальная, аб'ектная і суб'ектная [9, с. 205 – 435]. Першая, згодна яго схеме, адлюстроўвае важнейшую яе функцыю – трансмісію (перадача) з пакалення ў пакаленне духоўных каштоўнасцей супольнасці; аб'ектная – тое, што падлягае перадачы, а суб'ектная – адносіны дадзенага пакалення да мінулага, яго згода або нязгода на ўспрыняцце каштоўнасцей папярэднікаў і нават пратэст супраць іх [9, с. 284]. Ён справядліва крытыкуе кожны з гэтых падыходаў, якія альбо звужаюць паняцце традыцыі толькі да аб'екту ці суб'екту, што няправільна, таму, што такая трактоўка не дае ўяўлення аб працэсе іх бытавання і перадачы нашчадкам. А калі якая-небудзь з'ява не перададзена другому пакаленню, яна перастае быць традыцыяй. Больш таго, не кожнае пакаленне згаджаецца прыняць старыя традыцыі, пакінутыя мінулымі пакаленнямі. Многія даследчыкі традыцый пашыралі аб'ём «аб'екта» традыцый да ўсёй культуры ў цэлым (Р. Лоу, В. Маліноўскі і інш.). У нашым выпадку аб'ектамі традыцыі з'яўляюцца сямейнае выхаванне, побыт, фальклор, святы, абрады, цацкі, гульні і г.д., а таксама спосабы іх арганізацыі. Зразумела, што не самі яны з'яўляюцца традыцыяй, а працэс іх бытавання і трансмісіі наступным пакаленням. Філосаф І.В. Суханаў, этнограф К.В. Чыстоў таксама лічылі, што «традыцыя» вельмі блізкая да паняцця «культура». Вядомы этнограф С. Лур'е падтрымліваў гэту пазіцыю: «паняцце "культура" і паняцце "традыцыя" практычна сінанімічныя». Ён пісаў, што «этнас у сваю чаргу можа разглядацца як носьбіт традыцыі, але толькі ў тым выпадку, калі традыцыя разумеецца як комплекс культурных парадыгм, моцна сцэпленых адна з другой і ўяўляючых устойлівую цэласнасць…» [7, с. 42 – 43]. На наш погляд, больш дакладнае і канкрэтызаванае азначэнне традыцыі, якое ўлічвае папярэднія тэорыі, прыводзіць У.М. Грыгор'еў, які трактуе яе, як «захаванне, беражлівае абнаўленне і перадача ад пакаленняў да пакаленняў адабраных грамадскай думкай узораў культуры і перш за ўсё выпрабаваных спосабаў дзейнасці, паводзін» [4, с. 4]. Традыцыя не з'яўляецца за-

стылай формай, яна, на думку многіх даследчыкаў, развіваецца пад уплывам інавацый, што традыцыі і сучаснасць узаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Сама традыцыя ў сучасных зменлівых умовах мае значныя адаптыўныя здольнасці, спараджаючы спецыфічна нацыянальныя формы мадэрнізацыі [7, с. 172 – 173].

Нас цікавіць не проста традыцыя, а этнічная традыцыя, якая, па азначэнні Л.Н. Гумілёва, уяўляе іерархію стэрэатыпаў і правіл паводзін, культурных канонаў і гаспадарчых форм, установак светаўспрымання і г.д., характэрных для этнасу, якія перадаюцца шляхам трансмісіі. Назапашаная этнічная традыцыя этнасу надае яму своеасаблівасць і вызначае месца сярод іншых народаў. Яна не ўзнікае на пустым месцы, а з'яўляецца спалучэннем традыцыйных, запазычаных у папярэдніх пакаленняў і прынцыпова новых рыс. Традыцыя выконвае некалькі функцый: акумуляцыі, кансервацыі, трансляцыі сацыяльнага вопыта, рэгуляцыі, сацыялізацыі і інш. У этнаграфічным вывучэнні дзяцінства вельмі важным з'яўляецца механізм уздзеяння традыцыі на выхаванне і сацыялізацыю дзяцей і падлеткаў. Пры разглядзе праблемы тэорыі станаўлення і эвалюцыі традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стагоддзях рашаючымі для нас з'яўляюцца пытанні метадалогіі, узятыя цэласна ў адзінстве яго ўзроўняў: філасофскага, агульнанавуковага, этналагічнага. Этналагічнае вывучэнне дзяцінства ўключае разгляд тых сацыяльных працэсаў, якія канцэнтрыруюцца ў традыцыйна-бытавой культуры. Размова ідзе аб традыцыйных інстытутах і метадах выхавання і сацыялізацыі, якія перадаюцца праз традыцыю. Па словах І.С. Кона, пад «традыцыйнымі формамі сацыялізацыі разумеюцца такія адносіны і інстытуты, якія глыбей за ўсё ўкаранёныя ў традыцыйна-бытавой культуры народа і з якімі прама ці ўскосна асацыіруюцца ўяўленні аб спецыфіцы і пераемнасці яго характару і ладу жыцця» [6, с. 5]. Мы разглядаем традыцыю ў якасці механізму фарміравання, перадачы, засваення і фарміравання духоўных якасцей. Згодна тэорыі культурнай традыцыі Э.С. Маркарана, традыцыя вычляняецца з культуры, захаваўшы пры гэтым усе яе складаючыя. Такая інтэрпрэтацыя традыцыі дазваляе выявіць інварыянтныя характарыстыкі паняцця «традыцыя», «звычай», «рытуал», «абрад», а таксама функцыю традыцыі па перадачы і ўзнаўленню народнай спадчыны і асноўныя сацыяльныя інстытуты выхавання (сям'я, царква, дзяржава, грамадства, школа). Маюцца розныя аспекты выхаваўчага працэсу традыцыі, сярод якіх важнейшае месца займаюць: педагагічны, які валодае змястоўнай характарыстыкай, формамі і сродкамі выхавання, выверанымі шматвяковым вопытам іх выкарыстання; духоўная спадчына, звычаі, сацыяльныя нормы, культурныя каштоўнасці грамадства, якія перадаюцца шляхам сямейнага выхавання і сацыялізацыі аспекты сямейных традыцый.

На думку Я.У. Шышкінай, «найменш распаўсюджанай формай актуалізацыі з'яўляецца адраджэнне традыцыі без вяртання ў мінулае. У традыцыі актуалізуецца не столькі стабілізуючая, колькі інавацыйная функцыя, калі гістарычны ўзор не капіруецца, а робіцца спроба яго асэнсавання і развіцця ў адпаведнасці з патрэбнасцямі сённяшняга дня» [10, с. 12].

Метадалагічную і тэарэтычную базу даследавання складаюць структурна-функцыянальны, сістэмы, гісторыка-сацыялагічны, культуралагічны, каштоўнасны, інстытуцыяльны падыходы. Даследаванне абапіраецца на фундаментальныя працы заснавальнікаў указаных падыходаў, іх паслядоўнікаў, якія распрацоўваюць праблематыку, блізкую дадзенай тэме. Важную ролю адыграла выкарыстанне тэарэтычных распрацовак агульнаэтнаграфічнага, сацыялагічнага характару, у той або іншай ступені звязаных з той або іншай праблемай. Выкарыстаны таксама тэарэтычныя палажэнні, непасрэдна накіраваныя на праблемы сям'і і выкананне ёй сваіх функцый. Гэта працы сацыёлагаў і сацыяльных псіхолагаў (Б.Г. Ананьеў, Г.М. Андрэева, С.І. Голад, Т.А. Гурко, І.С. Кон. М.С. Мацкоўскі, А.Г. Харчаў і інш.). У рабоце выкарыстаны асобныя педагагіч-ныя падыходы, распрацаваныя ў працах па сацыялізацыі дзяцей (Л.С. Выгоцкі, А.В. Мудрык, В.А. Сысенка і інш.). Метадалагічным фундаментам працы з'яўляеццца структурна-функцыянальны падыход і міждысцыплінарны характар даследавання. Кірунак даследавання абумоўлена галоўнай мэтай раскрыцця эвалюцыі традыцый сямейнага выхавання беларусаў ў XIX – XX стагоддзях. Даследаванне традыцый сямейнага выхавання праведзена ў двух напрамках: эвалюцыя сям'і і становішча дзяцей у сувязі з мяняючыміся ўмовамі іх выхавання, сацыялізацыі і сацыяльнага статусу бацькоў; вывучэнне эвалюцыі рэальнай практыкі выхавання ў сям'і: форм, метадаў, сродкаў выхавання, ролі родных і сваякоў у выхаванні, эвалюцыя працоўнай дзейнасці дзяцей, а таксама працэсаў узаемадзеяння з сям'ёй іншых удзельнікаў сацыялізацыі (групы аднагодкаў, абшчыны і інш.).

Асноўным напрамкам у этнаграфічным вывучэнні роднасных сувязяў і іх ролі ў выхаванні і сацыялізацыі дзяцей і моладзі было даследаванне нарматыўных народных уяўленняў аб родных і сваяках і іх тэрміналагічнай інтэрпрэтацыі. Рэальная практыка паводзін паміж роднымі ў айчыннай навуковай літаратуры практычна не асвятлялася за выключэннем адносін паміж самымі блізкімі роднымі (бацькі – дзеці; браты – сёстры; дзядулі, бабулі – унукі). Таму ў працы была пастаўлена задача – прааналізаваць больш шырокі спектр сацыяльных сувязяў: паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі, братамі і сёстрамі (у тым ліку, і дваюраднымі, і траюраднымі), кумамі і хроснымі бацькамі і г.д. У метадалагічным вывучэнні роднасна-сваяцкіх сувязяў для нас уяўляе цікавасць даследаванне выкладчыка гісторыі Каліфарнійскага універсітэта (ЗША) Сімона Тойшэра, у якім аналізуецца тэрміналогія роднасці, разглядаецца сетка роднасных сувязяў, зыходзячы з разумення роднаснай салідарнасці. У канцэпцыі аўтара роднасныя сувязі эксплііцытна ўвязваюцца з працэсам утварэння дзяржавы [8, с. 215].

Асобую метадычную і параўнальна-гістарычную каштоўнасць для нашага даследавання маюць працы замежных і расійскіх даследчыкаў па асобных аспектах полаўзроставых адносін дзяцей у пэўныя

гістарычныя перыяды, праблемах узроставага сімвалізму, асаблівасцях абрадаў узроставага пераходу ў розных народаў (Арнольд ван Геннеп, Т.А. Бернштам, І.С. Кон і інш.). Прыярытэт у стварэнні канцэпцыі абрадаў пераходу належыць французскаму этнографу Арнольду ван Геннепу. Згодна яго ідэі, сутнасць жыцця складаецца з паслядоўнай змены этапаў – пераходу з аднаго стану ў другі; заканчэнне аднаго этапа і пачатак другога ўтвараюць сістэмы аднаго парадку. Імі з'яўляюцца: нараджэнне, дасягненне сацыяльнай спеласці, шлюб, бацькоўства, павышэнне грамадскага становішча, прафесійная спецыялізацыя, смерць [3, с. 9]. Гэтыя этапы суправаджаюцца цырымоніямі, якія маюць мэтай забяспечыць чалавеку пераход з аднаго стану ў другі і азначаюць змену сацыяльнага статусу. Такія абавязковыя рытуалы існуюць у кожным грамадстве незалежна ад традыцый і эканамічнага развіцця. На аснове вывучэння велізарнага матэрыялу з жыцця розных народаў свету даследчык даказаў універсальнасць гэтай з'явы. Для нашага даследавання гэта мае значэнне для аналізу рэліктавых форм культуры, галоўным чынам рытуальных, на беларускім матэрыяле. Даследаванне ажыццяўлялася ў рэчышчы культуралагічнага і аксіялагічнага падыходаў. Культуралагічны падыход разглядае традыцыйную народную педагогіку як неад'емную частку духоўнай культуры беларусаў, якая з'яўляецца асноўным каналам яе трансляцыі, які і фарміруе асобу як носьбіта і творцы роднай культуры. Аксіялагічны падыход дазваляе разглядаць яе як сацыякультурны феномен, які зберагае традыцыйныя маральныя каштоўнасці беларусаў. Для больш дэталёвага аналізу тых ці іншых праблем дзяцінства неабходна было распрацаваць працэдуру правядзення даследавання, выбраць адпаведныя метады і спосабы іх прымянення. Выкарыстаны разнастайныя метады даследавання: параўнальна-гістарычнага і структурна-функцыянальнага аналізу, сацыялагічнага апытання і статыстыкі, непасрэднага назірання і сфакусіраванага інтэрв'ю, тэарэтычнага аналізу, сінтэзу і гісторыка-педагагічнай інтэрпрэтацыі інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў розных крыніцах па дадзенай тэме. Прымянялася таксама сістэматызацыя нагляданняў і апісанняў рэальнага педагагічнага вопыту народа ў эксперыментальна-палявых умовах, іх тэарэтычная і метадалагічная інтэрпрэтацыя і абагульненне. Выкарыстоўваліся таксама метады тэарэтычнага аналізу этнаграфічных, навукова-педагагічных, культуралагічных крыніц; метад гісторыка-лагічнага аналізу архіўных матэрыялаў, фальклорных твораў; метады ўключанага назірання і апісання рэальнага выхаваўчага вопыту беларусаў у экспедыцыйна-палявых умовах; дакументаванне і збор матэрыялаў па традцыях сямейнага выхавання, запісы бясед з носьбітамі традыцый, доўгажыхарамі, інтэрпрэтацыя афіцыйных статыстычных і гістарычных дакументаў.

**Заключэнне.** Тэарэтычны аналіз даследаванняў, арыентаваных на вывучэнне дзяцінства з пункту гледжання этнаграфіі і сумежных навук, паказаў, што іх кола вельмі шырокае, як і выкарыстанне разнастайнай метадалогіі. Тым не менш іх вылучае нераўнамернасць у вывучэнні культуры дзяцінства, стылю і традыцый выхавання ў гістарычнай перспектыве. Не існуе адзінай методыкі ў вывучэнні традыцый выхавання, якая б улічвала важнейшыя фактары: эвалюцыю тыпаў сям'і, сістэму роднасных, саслоўных, суседскіх, сяброўскіх і іншых міжасабовых адносін, каштоўнасных арыентацый культуры, а таксама фактары часу і сацыяльных змен. Сабраныя даследчыкамі этнаграфіі дзяцінства матэрыялы па розных народах, як правіла, тэарэтычна недастаткова асэнсаваныя і па большай частцы апісальныя. Вельмі часта ў педагагічных даследаваннях, напрыклад, не адрозніваюцца сацыяльна-маральныя ідэалы выхавання дзяцей і рэальная педагагічная практыка, якая можа адрознівацца. Патрабуецца міждысцыплінарны падыход да даследавання цэласнай карціны ладу жыцця дзяцей у беларусаў, вызначэння гістарычна склаўшыхся народных традыцый выхавання, лепшыя з якіх неабходна выкарыстоўваць у сучаснай практыцы.

ЛІТАРАТУРА


1. Арьес, Ф. Ребенок и семейная жизнь при старом порядке / Ф. Арьес; пер. с фр. Я.Ю. Старцева; примеч., посл. Е.Ю. Фатеева. – Екатеринбург: Изд-во Уральского ун-та, 1999. – 415 с.
2. Выготский, Л.С. Собр. соч.: в 6 т. / глав. ред. А.В. Запорожец / Л.С. Выготский. – М.: Педагогика, 1984. – Т. 4: Детская психология. – 432 с.
3. Ван Геннеп, А. Обряды перехода: Систематическое изучение обрядов / А. Ван Геннеп; пер. с фр. Ю.В. Ивановой, Л.В. Покровской; послесл. Ю.В. Ивановой; РАН, Ин-т этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо-Маклая. – М.: Вост. лит. 1999. – 198 с. (Этногр. библ.).
4. Григорьев, В.М. Народная педагогика игры: Вопросы методологии и теории: в 2 ч. – Ч. 1 / В.М. Григорьев. – М.: ОДИ-International, 1996. – 70 с.
5. Демоз, Л. Психоистория / Л. Демоз. – Ростов н/Дон: Феникс, 2000. – 512 с.
6. Кон, И.С. Этнография детства. Историографический очерк / И.С.Кон // Этнография детства. Традиционные формы воспитания детей и подростков у народов Восточной и Юго-Восточной Азии / И.С. Кон. – М.: Наука, 1983. – С. 3 – 50.
7. Лурье, С.В. Историческая этнология: учеб. пособие для вузов / С.В. Лурье. – М.: Аспект-Пресс, 1997. – 448 с.
8. Тойшер, С. Предписанное родство. Нормы и практики родственных отношений в Берне на рубеже XV – XVI вв. / С. Тойшер // Семья, дом и узы родства в истории. – СПб.: Алетейя, 2004. – С. 200 – 236.
9. Шацкий, Е. Традиция. Обзор проблематики / Е. Шацкий; пер. с пол. – М., 1990.
10. Шишкина, Е.В. Этнокультурная вариативность семейной социализации на примере русских и удмуртов: междисциплинарный подход: автореф. дис. ... канд. ист. наук. – М., 2004. – 22 с.


*Паступіў 18.03.2009*